# НАС АБ'ЯДНАЛА «МЫ І ЧАС»



Рэдакцыя газеты «Мы і час» для студэнтаў факультэта беларускай філалогіі і культуры была аддушынай і цёплым агеньчыкам. Сюды хацелася зазірнуць да лекцыйных ці практычных заняткаў, пасля іх, а таксама падчас перапынкаў. Мяркую, для многіх яна стала тым месцам, дзе можна было раскрыць свае творчыя здольнасці, атрымаць слушную параду ці канструктыўную крытыку. А рэдактар газеты для ўсіх студэнтаў была сябрам і дарадцам, яна заўсёды падтрымлівала добрым словам і парадай. Думаю, чаяванні з прысмакамі з нагоды дня народзінаў, Новага года, 8 Сакавіка, Дня друку памятаюць многія. За імі ў цёплай творчай атмасферы чыталіся вершы, абмяркоўваліся надзённыя пытанні, клопаты і праблемы.

Я жадаю газеце верных сяброў, чытацкай любові і прызнання. Няхай і надалей рэдакцыя будзе другім домам для будучых журналістаў, якія толькі робяць першыя крокі ў гэтай прафесіі.

**Алена НАБЕЕВА,**
**выпускніца факультэта беларускай філалогіі і культуры, загадчык аддзела пісем рэдакцыі газеты «Браслаўская звязда».**



Паважаная рэдакцыя! З вялікім задавальненнем дасылаю віншавальны ліст з нагоды 20-годдзя газеты «Мы і час».

Па законах жанру трэба было б пачаць віншаванне з пажаданняў і ўзнёслых слоў. Але мне хочацца падзяліцца ўспамінамі і прызнаннем. Мне пашчасціла, што вучоба на факультэце беларускай філалогіі і культуры ВДУ імя П.М. Машэрава звязала мой жыццёвы шлях з рэдакцыяй універсітэцкай газеты «Мы і час». І гэта не перабольшванне. Знаёмства з яе рэдактарам Настассяй Пятроўнай Лазебнай стала для мяне першай прыступкай да пазнання будучай прафесіі і вернасці абранай справе. Напісанне матэрыялаў, удзел у падрыхтоўцы газеты да друку, цеснае знаёмства з «журналісцкай кухняй» і яе галоўнымі прадстаўнікамі, першы запіс у працоўнай кніжцы і першы заробак – тыя незабыўныя старонкі са студэнцкага жыцця, якія ўжо больш за восем гадоў саграваюць цёплымі ўспамінамі.

Я шчыра ўдзячна супрацоўнікам рэдакцыі газеты «Мы і час» і майму першаму рэдактару Настассі Пятроўне Лазебнай. Няхай і надалей газета радуе цікавымі разнастайнымі публікацыямі, лёгкай падачай інфармацыі і ўдалай вёрсткай. Калектыву рэдакцыі жадаю творчых поспехаў і здзяйснення, невычэрпнага натхнення, удзячных чытачоў, шчасця ва ўсіх яго праявах і дабрабыту! З юбілеем!

**Вольга БАНШЧЫКАВА,**
**выпускніца факультэта беларускай філалогіі і культуры, карэспандэнт газеты «Новополоцк сегодня».**



Упершыню пераступіўшы парог рэдакцыі газеты «Мы і час», я нават не адразу зразумела, куды трапіла: настолькі незвычайным мне падалося гэтае месца. Яно зусім не было падобным да рэдакцыі раённай газеты, з якой я супрацоўнічала да паступлення ў нашу ВНУ.

Ва ўніверсітэцкай рэдакцыі супрацоўнікі не проста займаліся стварэннем выдання, гэтае месца было цэнтрам студэнцкага жыцця. І калі б я ні заходзіла, тут заўсёды стаяў пах друкаваных старонак, а на стале ляжалі велізарныя слоўнікі. І – што самае прыемнае – усе размаўлялі па-беларуску. З асалодай слухаючы рэдактара Настассю Пятроўну, яе цікавыя гісторыі і ўрыўкі з яшчэ не надрукаваных твораў, я сама не заўважыла, як стала членам вялікай рэдакцыйнай сям'і.

Тут мы бавілі свой вольны час, сюды беглі на вялікім перапынку (а маглі і падчас заняткаў), каб даведацца пра свежыя ўніверсітэцкія навіны, атрымаць рэдакцыйнае заданне і паслухаць новыя «пыркі» Настассі Пятроўны. Усе студэнцкія гады я і мае аднагрупнікі не проста друкаваліся ў «Мы і час», мы тут жылі, сябравалі, адзначалі святы і свае маленькія перамогі. А веды і вопыт, атрыманыя за гэты час, дапамаглі нам на практыцы зразумець, што такое сапраўдная журналістыка. Ніводны падручнік, ніводны напісаны канспект не растлумачаць недахопы і памылкі ў вашым тэксце, не падкажуць, як зрабіць матэрыял цікавым для чытача, не падбадзёраць падчас няўдачы. Гэта могуць зрабіць толькі людзі, адданыя сваёй справе, людзі, якіх мне пашчасціла сустрэць у «Мы і час» і якіх я з гонарам магу назваць сваімі сябрамі і настаўнікамі ў прафесіі.

**Юлія ГАЎРЫЛЕНКА,**
**выпускніца філалагічнага факультэта, загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Жыццё Прыдзвіння».**